ства приобретает престижный оттенок, не утрачивая своих достоинств, наблюдается совпадение аксиологического и нормативного типов присвоений. Но и в этом случае постижение произведения может быть поверхностным. Всё зависит от процесса восприятия (глубины, качества и т.д.) музыки.

Предлагая псевдохудожественные эталоны в популярной музыке, мода эксплуатирует юношескую жажду новизны и унифицирует недостаточно развитое эстетическое сознание старшеклассников. Модные новинки, проходя сквозь призму непритязательных оценок, воспринимаются неадекватно, а значит, не происходит должной фильтрации звукового материала. Если в школьном возрасте не заложена определённая система знаний, не развиты вкусы и оценочные критерии, не выработана потребность в приобщении к высокому искусству, то со временем заполнить духовную пустоту становится всё сложнее. С нашей точки зрения, музыкальная мода — это стихийно направленный (т.е. управляемый шоу-бизнесом и неупорядоченный в отношении воздействия на различные слои общества) способ стандартизации эстетического сознания человека, кратковременная норма престижно-статусного освоения музыки. Обозначая проблему взаимодействия музыкальной моды и личности мы считаем целесообразным говорить о моде на музыкальные произведения, музыкальные стили, способы музицирования, символы и знаки музыкальной моды.

**Список использованной литературы**


1. *Беккер, Г.* Современная социологическая теория в её преемственности и изменении / Г. Беккер, А. Босков. — М. : Наука, 1961.
2. *Кант, И.* Сочинения : в 6 т. / ред. Т. И. Ойзерман. — М. : Мысль, 1966. — Т. 6.
3. *Кон, И.* С. Психология ранней юности : книга для учителя / И. С. Кон. — М. : Просвещение, 1989.
4. *Кузнецова, Т. В.* Влияние моды на развитие эстетического восприятия искусства / Т. В. Кузнецова // Формирование эстетического отношения к искусству : сб. в 10 т.; отв. ред. и сост. В. Г. Бутенко. — М. : АПН СССР, 1991. — Т. 5.
5. *Лисовский, В. Т.* Что значит быть современным / В. Т. Лисовский. — 3-е изд., доп. — М. : Политиздат, 1983.
6. *Липовецки, Ж.* Царство эфемерного : мода и её судьба в современном обществе / Ж. Липовецки // РЖ. Сер. «Философия и социология». — 1989. — № 5.
7. Мода: за и против / под ред. В. И. Толстых. — М.: Искусство, 1973.
8. *Перов, Ю. В.* Художественная жизнь общества как объект социологии искусства / Ю. В. Перов. — Л. : Изд-во ЛГУ, 1980.
9. *Шубин, Г. Г.* Мода и эстетическая культура / Г. Г. Шубин. — М. : Знание, 1987.
10. *Ясиевич, В. Е.* О стиле и моде / В. Е. Ясиевич. — К.: Мыстецтво, 1968.


# УПЛЫЎ СУЧАСНЫХ САЦЫЯКУЛЬТУРНЫХ УМОЎ НА АРГАНІЗАЦЫЮ ЧЫТАЦКАЙ ДЗЕЙНАСЦІ ПАДЛЕТКАЎ

**І. А. МАРОЗАВА,**
аспірантка Беларускага дзяржаўнага універсітэта культуры і мастацтваў

Працэсы, якія адбываюцца ў сацыякультурным асяроддзі, уплываюць на ўсе сферы чалавечай дзейнасці, у тым ліку і на чытацкую дзейнасць. У наш час надаецца вялікае значэнне вывучэнню праблем чытання, тых умоў, у якіх яно развіваецца, бо праз чытанне адбываецца фарміраванне развітога ў інтэлектуальных, сацыяльных, культурных адносінах чалавека, што вызначае ўзровень культуры грамадства ўвогуле. Змены ў чытанні непасрэдна закранаюць дзейнасць бібліятэк, якія абслугоўваюць дзяцей і падлеткаў, патрабуюць пошуку новых падыходаў у бібліятэчным абслугоўванні, шляхоў узаемадзеяння з чытачамі-падлеткамі, развіцця іх чытацкай дзейнасці, выкарыстання ў рабоце сучасных інфармацыйных тэхналогій. Таму праблемы развіцця чытацкай дзейнасці ў бібліятэчным асяродку з'яўляюцца актуальнымі і сацыяльна значнымі.

Вывучэнню зменаў у чытанні дзяцей і падлеткаў удзяляюць увагу такія даследчыкі, як В. П. Чудзінава, Н. Е. Дабрыніна, А. І. Лебедзева,

А. Л. Кабачак, І. І. Ціхамірава і інш. Яны вывучаюць пытанні асаблівасцяў чытання дзяцей і падлеткаў па дадзеных сацыялагічных даследаванняў, на падставе якіх робяць глыбокія абагульненні і прадстаўляюць цэласную карціну дзіцячага чытання ў цяперашні час. У адпаведнасці з асаблівасцямі чытання дзяцей і падлеткаў узнікаюць праблемы ў бібліятэчным абслугоўванні, розныя аспекты якога вывучаюць бібліятэказнаўцы В. П. Чудзінава, Ю. М. Дрэшэр, С. Галаўко і інш.

Узнікла неабходнасць паказаць, якім чынам сучасныя праблемы чытання падлеткаў уплываюць на бібліятэчнае абслугоўванне гэтай узроставай групы, і вызначыць магчымыя накірункі развіцця работы бібліятэк з падлеткамі. У Хартыі ў абарону чытача, прынятай на XXIV з'ездзе Міжнароднай асацыяцыі выдаўцоў (1992), былі вызначаны сферы, у якіх адбываецца ўплыў чытання на жыццё чалавецтва:

— культура і навука (чытанне друкаваных выданняў — сродак, з дапамогай якога магчыма аваладанне культурнай і навуковай спадчынай шматлікіх пакаленняў людзей);

— сацыяльная (чытанне з'яўляецца перадумовай актыўнага і асэнсаванага ўдзелу чалавека ў грамадскім жыцці);

— развіццё творчых магчымасцяў чалавека (чытанне — рашаючы крок у станаўленні і развіцці асобы чалавека, фарміраванні яго поглядаў на навакольны свет і іншых людзей) і г.д. [6, с. 36—37].

Узровень развіцця чытацкай дзейнасці дзяцей і падлеткаў вызначае, наколькі паспяхова будзе праходзіць іх адаптацыя і самарэалізацыя ў грамадстве. В. П. Чудзінава падкрэслівае каштоўнасць дзіцячага чытання, яго вялікае значэнне, параўноўвае чытанне дзяцей з ключом да іх жыцця ў інфармацыйным грамадстве [8].

Чытацкая дзейнасць дзяцей і падлеткаў абумоўлена сучаснай сацыякультурнай сітуацыяй і залежыць ад развіцця сістэмы масавых камунікацый, канкурэнцыі друкаваных, аудыёвізуальных, электронных каналаў распаўсюджвання інфармацыі, ад вырашэння праблем, звязаных са стварэннем, выданнем і распаўсюджваннем літаратуры для дзяцей і падлеткаў.

На чытацкую дзейнасць падлеткаў уплывае масавая культура, якая фарміруе невысокі ўзровень чытацкага густу, інтарэсаў, пераваг. Важнай умовай развіцця чытацкай дзейнасці падлеткаў з'яўляецца рэфармаванне ў адукацыйнай і выхаваўчай сферах: павелічэнне нагрузкі ў вучэбнай дзейнасці, павышэнне патрабаванняў да якасці і глыбіні ведаў школьнікаў. Інтэнсіўнасць працэсаў інфарматызацыі грамадства, павелічэнне колькасці карыстальнікаў Інтэрнэту таксама накладаюць адбітак на чытанне дзяцей і падлеткаў.

Важнай умовай развіцця дзіцячага чытання, на наш погляд, з'яўляюцца спробы пастутова змяніць адносіны да чытання ў грамадстве, увесці ў свядомасць людзей думку аб неабходнасці чытання і яго незаменнасці для кожнага асобнага чалавека І для грамадства.

У 80-х гадах XX стагоддзя на Захадзе і ў 90-х гадах у Беларусі, Расіі, краінах блізкага замежжа пачалі гаварыць аб крызісе чытання. Можна вызначыць агульныя тэндэнцыі гэтай з'явы: падзенне прэстыжу чытання і скарачэнне долі чытання ў структуры вольнага часу [8].

Па выніках аналізу сацыялагічных даследаванняў, якія праводзіліся ў Расіі, В. П. Чудзінава прадставіла «адыходзячую» і «новую» мадэлі чытання дзяцей і падлеткаў. Для «новай» мадэлі ўласціва:

— скарачэнне долі чытання ў структуры вольнага часу;

— перавага дзелавога чытання па школьнай праграме над чытаннем у вольны час;

— перавага забаўляльнай літаратуры і ілюстраваных часопісаў над іншымі творамі.

Вялікі ўплыў на чытанне аказвае аудыёвізуальная і электронная культура, што праяўляецца ў наступных момантах:

— змяняецца ўспрыманне друкаванага тэксту (яно робіцца больш павярхоўным і фрагментарным, «мазаічным»);

— змяняецца матывацыя чытання і чытацкія перавагі (цікавасць да асобных твораў, відаў, жанраў літаратуры фарміруецца пад уплывам тэлебачання і відэапракату);

— перавага аддаецца друкаванай прадукцыі з шырока прадстаўленым відэарадам;

— адбываецца спрашчэнне маўлення, паколькі дзеці не засвойваюць мову класічнай спадчыны [7].

У апошні час вучоныя паднялі праблему развіцця функцыянальнай, ці другаснай, непісьменнасці, якая праяўляецца ў тым, што чалавек паступова губляе навыкі чытання і пісьма, калі ён не падтрымлівае іх і не развівае. Недастаткова ўмелае чытанне і пісьмо падлеткаў можа прывесці да функцыянальнай непісьменнасці ў дарослым узросце. Гэта прыводзіць да праблем у побыце, вучобе, прафесійнай дзейнасці і ўплывае на канкурэнтаздольнасць на працоўным рынку [8].

Такім чынам, абагульняючы адзначанае вышэй, можна выявіць характэрныя тэндэнцыі ў развіцці чытацкай дзейнасці:

ЦНБ НАН Беларуси

— паніжэнне статусу чытання ў жыцці дзяцей і падлеткаў;

— пагроза развіцця функцыянальнай непісьменнасці;

— уплыў на чытанне сучасных інфармацыйных тэхналогій.

Змены ў чытанні дзяцей і падлеткаў выклікалі хваляванне грамадскасці і асэнсаванне патрэбнасці ў падтрымцы і развіцці чытання ў замежных краінах і Расіі. Вырашэннем гэтай праблемы занятыя розныя сацыяльныя інстытуты, не апошняе месца сярод якіх належыць бібліятэкам.

Сацыякультурныя ўмовы і змены ў чытанні дзяцей і падлеткаў прадугледжваюць дынамічнае развіццё бібліятэчнага абслугоўвання, адной з галоўных задач якога з'яўляецца арганізацыя чытацкай дзейнасці. Пры гэтым перад бібліятэкарамі паўстае шэраг праблем, якія патрабуюць неадкладнага вырашэння.

Супрацьстаянне такой агульнай тэндэнцыі, як паніжэнне статусу чытання, магчыма ажыццявіць наступнымі шляхамі:

— вывучэнне свайго чытача;

— арыентацыя ў патоку твораў друку, прызначаных для чытання падлеткаў;

— наладжванне даверлівых узаемаадносін з чытачамі-падлеткамі;

— пошук новых формаў бібліятэчнага абслугоўвання, якія стымулююць чытанне.

Вывучэнне чытачоў-падлеткаў прадугледжвае атрыманне глыбокіх ведаў аб іх псіхафізіялагічным, псіхалагічным, сацыяльным развіцці. Гэтыя пытанні асветлены ў шматлікіх працах па псіхалогіі падлеткавага ўзросту. Бібліятэчнае абслугоўванне немагчыма без ведання чытацкіх асаблівасцяў падлеткаў, якія выяўляюцца па выніках шматлікіх даследаванняў на старонках друку. Бібліятэкарам важна самім праводзіць сацыялагічныя даследаванні чытацкай дзейнасці сваіх карыстальнікаў, якія ў комплексе з іншымі метадамі (назіраннем, аналізам бібліятэчных дакументаў, тэсціраваннем і інш.) дазволяць зразумець праблемы падлеткаў у гэтым накірунку з мэтай іх пераадолення.

Праблема арыентацыі падлеткаў у друкаваных і электронных інфармацыйных рэсурсах востра паўстае перад бібліятэкарамі. Магчымасць не захлынуцца ў вялізным патоку літаратуры, выяўляць каштоўныя ці, наадварот, небяспечныя па змесце творы даюць сродкі рэкамендацыйнай бібліяграфіі. У якасці прыклада можна прывесці інтэрнэт-сайт рэкамендацыйнай бібліяграфіі Расійскай дзяржаўнай дзіцячай бібліятэкі «Библиогид» (http://www.bibliogid.ru), які арыентаваны ў першую чаргу на кіраўнікоў дзіцячага чытання і адначасова даступны старшым падлеткам. Яго асноўнымі задачамі з'яўляюцца рэгулярнае прадстаўленне litрознабаковай інфармацыі аб сучаснай літаратуры для дзяцей, прафесійных рэкамендацый у вобласці кніжнага пошуку і фарміраванне асноў культуры дзіцячага чытання [4]. Існуе некалькі друкаваных выпускаў альманаха «Библиогид: по страницам интернет-сайта».

У ЗША праблема арыентацыі ў электронных інфармацыйных рэсурсах вырашаецца шляхам стварэння і развіцця сайта «Бібліятэчнае кіраўніцтва ў кіберпрасторы» Асацыяцыяй бібліятэчнага абслугоўвання дзяцей. На сайце прадстаўлены спасылкі на лепшыя сеткавыя рэсурсы для дзяцей, бацькоў і выхавацеляў, настаўнікаў і бібліятэкараў [1].

Развіццю чытацкай дзейнасці падлеткаў немагчыма садзейнічаць без наладжвання з імі даверлівых узаемаадносін падчас бібліятэчнага абслугоўвання. Важна будаваць узаемадзеянне з падлеткамі на аснове гуманістычнага, асобасна арыентаванага падыходаў і дыялагічных прынцыпах, якія прадугледжваюць дастаткова поўнае адлюстраванне індывідуальных і асобасных якасцяў партнёраў па зносінах, станоўчыя адносіны партнёраў адзін да аднаго, выкарыстанне такіх спосабаў зносінаў, якія даюць магчымасць выяўлення і развіцця партнёраў. Адкрыты дыялог з бібліятэкарам садзейнічае развіццю ў чытача самастойнасці, актыўнасці, пераўтварэнню яго ў сапраўднага суб'екта зносінаў [5]. Відавочна, што наладжванне такіх узаемаадносінаў з чытачом патрабуе ад бібліятэкара высокай камунікатыўнай культуры.

Выклікаць цікавасць да літаратуры, выхаваць удумлівага чытача з добрым літаратурным густам дазваляе комплекс мерапрыемстваў, якія можа прапанаваць бібліятэка. У гэтым накірунку адбываецца пошук інавацыйных формаў бібліятэчнага абслугоўвання творчымі бібліятэкарамі. Акрамя традыцыйных формаў абслугоўвання у бібліятэках праводзяцца кніжныя аўкцыёны, аўкцыёны ведаў, кніжныя латарэі, ярмаркі чытацкіх меркаванняў, рэйтынгі начытанасці і інш. Цікавымі з'яўляюцца інавацыйныя наглядныя формы: выстаўкі-дыялогі, выстаўкі-дыскусіі, выстаўкі-слоўнікі, выстаўкі-віктарыны і інш. [2].

У пераадоленні тэндэнцыі развіцця функцыянальнай непісьменнасці перад бібліятэкай стаіць задача па фарміраванні культуры чытання. У адносінах да асобнага чытача культура чытання



ЦНБ НАН Беларусі

ўяўляе сабой сукупнасць дасягненняў асобы ў сферы чытацкага развіцця ў адпаведнасці з пэўным інтэлектуальна-адукацыйна-ўзроставым перыядам і з улікам пэўнага этапу сацыяльна-гістарычнага развіцця грамадства [3].

Даследчыца Ю. М. Дрэшэр выдзяляе такія бакі культуры чытання, як асэнсаванае, выбарачнае атрыманне інфармацыі і авалоданне ёй, арыентацыя ў інфармацыйных крыніцах, сістэматычнасць і паслядоўнасць чытання. Прадугледжваецца таксама выкарыстанне добра адпрацаванай тэхнікі чытання (хуткасць, аператыўнасць, арганізаванасць самаго працэсу) [3].

На чытанне падлеткаў аказваюць уплыў сучасныя інфармацыйныя тэхналогіі. У якасці альтэрнатывы друкаваным кнігам з'явіліся электронныя (тэкставыя, мультымедыйныя), пашыраецца выкарыстанне магчымасцяў Інтэрнэту, у якім падлеткі ўсё часцей шукаюць не толькі аператыўную інфармацыю, але і тэксты мастацкай літаратуры, наведваюць электронныя бібліятэкі. У сувязі з гэтым узнікла праблема тэхнічнага аснашчэння бібліятэк і засваенне інтэрнэт-прасторы. Даследчыкі вызначаюць новыя задачы, звязаныя з выкарыстаннем Інтэрнэту, якія павінны вырашацца ў бібліятэцы:

— фарміраванне ў юных карыстальнікаў навыкаў інфармацыйнай адукаванасці;

— дапамога ў навігацыі па інфармацыйных сетках;

— вывучэнне існуючых рэсурсаў Інтэрнэту для дзяцей і стварэнне новых [1].

Улічваючы тэндэнцыі развіцця чытацкай дзейнасці падлеткаў, задачы, якія ў сувязі з гэтым паўстаюць перад бібліятэчным абслугоўваннем, мэтазгодна ствараць праграмы падтрымкі і развіцця чытання, у якіх вызначаюцца мэта, задачы, мэтавая аудыторыя, тэрміны і механізмы рэалізацыі, асноўныя мерапрыемствы, чаканыя вынікі.

Такім чынам, на чытацкую дзейнасць падлеткаў аказвае ўплыў сацыякультурная сітуацыя. Асаблівасці чытацкай дзейнасці падлеткаў, у сваю чаргу, патрабуюць развіцця бібліятэчнага абслугоўвання, адна з галоўных задач якога — пераадолець негатыўныя тэндэнцыі ў чытанні дзяцей і падлеткаў.

Тэндэнцыя да паніжэння статусу чытання выклікае неабходнасць зацікавіць падлеткаў творамі друку, падтрымліваць сістэматычнасць чытання і садзейнічаць яго развіццю. Гэта патрабуе вывучэння чытацкіх і асобасных якасцяў падлетка, арыентацыі ў творах друку, якія ўваходзяць у кола яго інтарэсаў, устанаўленне з чытачамі даверлівых узаемаадносінаў у працэсе бібліятэчных зносінаў, пошуку інавацыйных формаў бібліятэчнага абслугоўвання.

Занепакоенасць магчымасцю развіцця функцыянальнай непісьменнасці патрабуе фарміравання ў падлеткаў — карыстальнікаў бібліятэкі культуры чытання. Уплыў сучасных інфармацыйных тэхналогій на чытацкую дзейнасць падлеткаў прадугледжвае выкарыстанне ў бібліятэчным абслугоўванні электронных выданняў, магчымасцяў Інтэрнэту.

Праз веданне асаблівасцяў чытацкай дзейнасці падлеткаў у сучасных сацыякультурных умовах і магчымасці бібліятэчнага аслугоўвання па яго развіцці мэтазгодна ствараць праграмы падтрымкі і развіцця чытання, накіраваныя на фарміраванне культуры асобы.

**Спіс выкарыстанай літаратуры**

1. Библиотечное обслуживание детей и юношества: американский опыт : сб. / РГБ. — М., 2004. — 253 с.

2. *Головко, С.* Книгочей-тинейджер? Это реально! / С. Головко // Библиотека. — 2006. — № 10. — С. 6 — 10.

3. *Дрешер, Ю. Н.* Библиотерапия : учеб. пособие / Ю. Н. Дрешер; науч. ред. Т. И. Ключенко. — М. : Школьная б-ка, 2003. — 224 с.

4. *Копейкин, А. А.* «Библиогид» — интернет-сайт о детском чтении [Электронный ресурс] / А. А. Копейкин. — Режим доступа: http://www.gpntb.ru/win/inter-events/crimea2002/trud/sec1121/Doc3.HTML.

5. Психологический контакт библиотекаря с читателями : практ. пособие для библиотекарей / РГБ; сост. Т. О. В. Решетникова. — М., 1994. — 95 с.

6. Чтение и книжный рынок в информационном обществе / М. Е. Порядина, В. А. Сироженко, К. М. Сухорукое. — М. : РКП, 2006. — 128 с.

7. *Чудинова, В. П.* Чтение детей и подростков в России на рубеже веков: смена «модели чтения» [Электронный ресурс] / В. П. Чудинова. — Режим доступа: http://new.teacherfio.ru/news.php?n=284188c=1811.

8. *Чудинова, В. П.* Чтение детей как национальная ценность [Электронный ресурс] / В. П. Чудинова. — Режим доступа: http://www.chtenie-21.ru/proff/news/84.

ЦНБ НАН Беларусі